Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 36 (278) | Нядзеля, 30 снежня 1956 года | Цана 20 кап.




*Генадзій БУРАЎКІН*

## ЭСТАФЕТА ГАДОЎ

*Стрэлкі поўнач нам вось-вось пакажуць,*
*Тае звон курантаў угары...*
*Да Крэмлёўскіх сцен хадой паважнай*
*З Новым Годам крочыць Год Стары.*
*Як спартсмен спартсмену эстафету—*
*Поспехі і планы ўсе свае—*
*Урачыста ён у момант гэты*
*Юнай змене ў рукі аддае.*
*Колькі тут людскіх харошых шчасцяў,*
*Пратаптаных сцежак і дарог,*
*І дамоў, дзе толькі мур закласці*
*За кароткі шлях жыццёвы змог!..*
*Ён свайму нашчадку дaручае*
*Цэглу класці ў сцены тых дамоў,*
*Зняць увосень добрыя ўраджаі*
*З ім самім засеяных палёў.*
*Ён яму жадае новых планаў,*
*Новых шчасцяў, новых смелых мар,*
*І сустрэч для новых закаханых,*
*І нябёс без навальнічных хмар,—*
*Каб было не сорам ноччу гэткай*
*Пасля працы зноў прыйсці сюды,*
*Перадаць другому эстафету,*
*Што нясуць у комунізм гады.*

## КАБ ДОБРА ВЕДАЦЬ



Званок. Агульныя заняткі студэнтаў II курса хімічнага факультэта закончыліся. А зараз пачынаюцца групавыя работы. Мы паследвалі за студэнтамі 3-яй групы.

Лабараторыя аналітычнай хіміі. Тэма заняткаў—выяўленне ў растворах катыёнаў і аніёнаў. Кіраўнік груп Людміла Ільінічна Севасцянава, раздаўшы задачы, яшчэ раз напомніла, як праводзіць назіранні.

Нашу ўвагу прыцягнулі тры дзяўчыны, якія працавалі за адным сталом і ціха дзяліліся сваімі думкамі.

—У мяне аніёнам—кіслотны астатак сернай кіслаты,—расказвала Ядзя сваім суседкам,—бачыце, атрымаўся сернакіслы асадак.

— А ў мяне асадак—жоўты, крысталічны. Значыць, тут быў астатак фосфарнай кіслаты,—заўважыла Рэгіна.

І толькі ў Лоры пакуль што вопыт не ўдаваўся.

Лабараторныя работы дапамагаюць студэнтам больш глыбока асвоіць тэарэтычныя веды па аналітычнай хіміі, лепш падрыхтавацца да экзамена па гэтаму прадмету.

НА ЗДЫМКУ: Р. Харошка, Л. Лознева і Я. Васіленка ў лабараторыі за работай.

**Тэкст Ф. Савіцкага,**
**Фото М. Пільшчыкава.**

## КОМСАМОЛЬЦЫ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ПЫТАННІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЕСІІ

Комсамольскі сход, які адбыўся нядаўна на І курсе юрыдычнага факультэта, быў прысвечаны пытанню падрыхтоўкі студэнтаў да зімняй экзаменацыйнай сесіі. Сакратар комсамольскага бюро факультэта т. Зінкевіч, выступіўшыя ў спрэчках тт. Шэціхін, Камоза многа гаварылі аб недахопах у падрыхтоўцы да сесіі, рэзка крытыкавалі асобных студэнтаў. Прынцыповым было выступленне комуніста т. Пярунова, які ўзняў пытанне аб прапусках лекцый, аб дрэнных паводзінах студэнтаў Еніна, Букоўскай, Ганчаровай. Нездарма Букоўскую і Ганчарову на лекцыі па тэорыі дзяржавы і права пасля некалькіх заўваг папрасілі з аудыторыі. Сход рэзка асудзіў паводзіны гэтых таварышаў.

Член партыйнага бюро факультэта выкладчыца Н. С. Шавельская і студэнты старэйшых курсаў, якія прысутнічалі на сходзе, далі першакурснікам многа каштоўных парад і прапаноў, як лепш падрыхтавацца да сесіі.

# НА ФАКУЛЬТЭТАХ

### Выстаўка „Мы ў Маскве“

Студэнты II курса гістарычнага факультэта закончылі 1955—56 навучальны год правядзеннем вытворчай практыкі ў Гістарычным музеі Масквы. Яны дэталёва пазнаёміліся з наступнымі аддзеламі музея: першабытна - абшчынны лад на тэрыторыі СССР, старажытны свет на тэрыторыі Прычарнамор'я старажытна-руская дзяржава, утварэнне Маскоўскай дзяржавы, гісторыя Расіі ў XVIII і XIX стагоддзях, дзекабрысты.

Паралельна з работай у Гістарычным музеі студэнты наведалі Музей В. І. Леніна, Крэмль, універсітэт імя Ламаносава, Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку і іншыя славутасці сталіцы.

Нядаўна студэнты III курса, якія гэтым летам былі ў Маскве, падрыхтавалі фотавыстаўку «Мы ў Маскве». Яна расказвае аб знаходжанні студэнтаў у сталіцы, аб іх рабоце ў Гістарычным музеі.

**Г. СЛАВІНСКАЯ.**

### У нашых літаратараў

У рэдакцыі часопіса «Маладосць» была праведзена нарада маладых літаратараў нашага універсітэта. Выступіўшыя на нарадзе рэдактар часопіса А. Кулакоўскі і яго намеснік Г. Шчарбатаў гаварылі аб неабходнасці цяснейшай сувязі студэнтаў з часопісам.

У 12 нумары часопіса рэдакцыя змясціла творы нашых студэнтаў. З вершамі выступілі І. Сіпакоў, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, Ю. Свірко, К. Цвірка. Змешчаны апавяданні «Параска» В. Нікалаенка, «Плынь»—Б. Сачанкі. А. Клышко змясціў артыкул аб рукапісным часопісу «Творчасць журналіста». У артыкуле «Ідзе папаўненне» паэт Ніл Гілевіч расказвае аб літаратурных сілах універсітэта.

**М. АРЛОЎ.**
**А. СЕЧКІН,**

### НАМ СПАДАБАЛАСЯ

На трэцім курсе аддзялення журналістыкі была арганізавана лекцыя на тэму: «Міжнародная інфармацыя». Лекцыю прачытаў Н. Г. Лабаценка, лектар ЦК КПБ. Т. Лабаценка закрануў многа пытанняў міжнароднага жыцця, хвалюючых моладзь. Лекцыя была прачытана на высокім ідэйным узроўні і выклікала ў студэнтаў вялікае адабрэнне. Загадчык кафедры дацэнт М. С. Зерніцкі ад імя студэнтаў цёпла падзякаваў лектара.

**В. ДУШКЕВІЧ.**




Напярэдадні Новага года «Універсітэцкі вожык» запрасіў у рэдакцыю каменданта інтэрната юрыдычнага факультэта Шэрэмета, прадстаўніка нашай шматлікай кагорты аспірантаў, аднаго з выкладчыкаў і звярнуўся да іх з наступнымі пытаннямі:

**ВОЖЫК:—Паважаныя таварышы! Да канца старога года засталося зусім мала. Чым ён быў для вас знамянальны?**

**Усе (хорам):—Тым, што мы многа чаго зрабілі, але многага і не дарабілі.**

**ВОЖЫК:—Цяпер у мяне будзе запытанне да вас, таварыш Шэрэмет. Чым вы сустракаеце Новы год? (адказ на 4 стар.)**

**ВОЖЫК:—А як справы ідуць у аспірантаў? Ці многа дысертацый будзе абаронена ў наступным годзе? (адказ на 4 стар.)**

**ВОЖЫК:—Паважаны таварыш выкладчык, ці думаеце вы паляпшаць якасць сваіх лекцый? (адказ на 2 стар.)**



